








# Рэальная карысць ад віртуальных тэхналогій

## Якой можа быць нацыянальная электронная бібліятэка?

**Сёння бібліятэчная сетка Беларусі налічвае больш за сем тысяч публічных і спецыяльных бібліятэк, іх карыстальнікам з'яўляецца кожны чацвёрты жыхар Беларусі. У сувязі з выклікамі новага часу ўсё большую актуальнасць набывае пытанне арганізацыі аддаленага доступу да фондаў бібліятэк у электронным выглядзе. Прытым прадстаўнікі бібліятэк і стваральнікі інфармацыйных рэсурсаў надаюць асаблівую ўвагу пошуку кансэнсусу паміж агульнадаступнасцю інфармацыі і абаронай аўтарскіх правоў.**

Пераўтварэнне эканомікі на аснове лічбавых тэхналогій сёння з'яўляецца адным з нацыянальных прыярытэтаў і напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай дзяржавы. Адной з задач Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2021—2025 гады вызначаная інфарматызацыя і стварэнне нацыянальнага лічбавага кантэнту ў сферы культуры. У рамках згаданай праграмы мяркуецца стварэнне і развіццё электронных рэсурсаў бібліятэк як інфармацыйнай сістэмы для забеспячэння аддаленага доступу карыстальнікаў. Таксама прадугледжваецца мадэрнізацыя інфармацыйных сістэм і рэсурсаў, у тым ліку электроннага каталога бібліятэк Беларусі, удасканаленне тэлекамунікацыйнага і сканавальнага абсталявання бібліятэк, распрацоўка аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы кіравання электроннымі перыядычнымі выданнямі і прадстаўлення навуковых публікацый у міжнародных рэгістрах. Акрамя таго, мяркуецца стварэнне электроннага сховішча для пастаяннага захоўвання дакументаў бібліятэк Беларусі, а таксама алічбоўка фондаў музеяў, бібліятэк, аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны і кінафонду Беларусі.

### ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

Стварэнне сістэмы лічбавай трансфармацыі бібліятэчнай галіны Беларусі прадугледжвае работу па чатырох асноўных напрамках: гэта ўдасканаленне інфармацыйнай інфраструктуры, агрэгацыя нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў, стварэнне адзінай нацыянальнай бібліятэчнай платформы, якая будзе з дапамогай воблачных тэхналогій кіраваць як друкаванымі, так і электроннымі рэсурсамі, а таксама ўкараненне новых фарматаў прафесійнага навучання і абнаўленне зместу адукацыйных праграм з мэтай перападрыхтоўкі спецыялістаў, якія будуць валодаць навыкамі і кампетэнцыямі ў галіне лічбавых тэхналогій.

Летась у кожнай з абласцей Беларусі былі створаныя цэнтры па алічбоўцы выданняў для нацыянальнай электроннай бібліятэкі. У планах на будучыню — з'яўленне электроннай платформы і распрацоўка праграмнага забеспячэння для яе дзейнасці. Для фінансавання работы па арганізацыі электроннай бібліятэкі была пададзеная заяўка ў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі па ўключэнні гэтых мерапрыемстваў у Дзяржаўную праграму па лічбавым развіцці Беларусі на 2021—2025 гады — разгляд заявак мусіць адбыцца ў лютым.

### ЗАХАВАЦЬ І ЗРАБІЦЬ ДАСТУПНЫМІ

Як распавяла генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава, стварэнне электроннай бібліятэкі дазволіць захаваць у лічбавай форме рэдкія выданні, якія зберагаюцца не толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы, але і ў абласных бібліятэках. Таксама мяркуецца, што будуць прадстаўленыя выданні, на якія не распаўсюджваецца аўтарскае права, і кнігі тых аўтараў, якія перадалі бібліятэкам правы на алічбоўку і іх прадастаўленне ў агульнае карыстанне. Акрамя таго, у рамках электроннай бібліятэкі можа быць забяспечаны доступ і да лічбавых рэсурсаў і баз звестак бібліятэк іншых краін, з якімі заключаныя адпаведныя пагадненні.

Важнай перавагай электроннай бібліятэкі з'яўляецца прадастаўленне адзінага пункту доступу да мноства лакальных электронных рэсурсаў бібліятэк краіны, а таксама забеспячэнне эфектыўнай навігацыі па іх з дапамогай пошукавых сістэм. У Нацыянальнай бібліятэцы пераводзіць выданні ў лічбавую форму пачалі яшчэ ў 2002 годзе, а цяпер чарга дайшла і да рэгіянальных бібліятэк — тут перавагу аддаюць перадусім алічбоўцы краязнаўчых выданняў і перыёдыкі, якія складаней за ўсё захоўваць у папяровым выглядзе. Мяркуецца, што, калі ўзнікне адзіная агульнанацыянальная электронная бібліятэка, доступ да гэтай платформы будуць мець карыстальнікі ўсіх бібліятэк краіны.

> У электронных калекцыях Нацбібліятэкі можна знайсці ўсё, што заўгодна, — ад выданняў Францыска Скарыны да здымкаў моднага адзення 1970-х.

### КНІГІ, ДАКУМЕНТЫ, ПЕРЫЁДЫКА...

Нацыянальная бібліятэка пастаянна вядзе работу па стварэнні лічбавага кантэнту і пераводзе выданняў у электронны від. У 2020 годзе быў запушчаны анлайн-рэсурс, які аб'ядноўвае рукапісы сучасных беларускіх аўтараў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, а пазалетась былі прэзентаваныя Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь і анлайн-энцыклапедыя "Беларусь у асобах і падзеях".

Таксама актыўна вядзецца работа па стварэнні міжнародных лічбавых калекцый дакументаў: тут можна прыгадаць праект "Залатая калекцыя Еўразіі", накіраваны на прэзентацыю найбольш выдатных і каштоўных выданняў, якія прадстаўляюць культуры краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У рамках гэтага праекта Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі былі прадстаўленыя сто пяць выданняў — зрэшты, Беларусь з'яўляецца лідарам сярод усіх краін-удзельніц па колькасці выданняў, даступных у праекце.

Сумесна з Прэзідэнцкай бібліятэкай імя Б.М. Ельцына Нацыянальная бібліятэка Беларусі брала ўдзел у стварэнні электроннай калекцыі "Памяць аб вялікай перамозе", у якую беларускім бокам было прадстаўлена каля шасцісот дакументаў. Расійскія ж калегі, у сваю чаргу, перадалі для нашых лічбавых калекцый копіі амаль усіх памятных кніжак беларускіх губерняў, якія выдаваліся штогод у часы Расійскай імперыі і з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па гісторыі гэтага перыяду.

На сучасным, пачатковым этапе рэалізацыі канцэпцыі нацыянальнай электроннай бібліятэкі адбываецца збор дакументаў у лічбавай форме. Але ўжо робіцца ясна, што з'яўленне такой платформы значна аблегчыць доступ да рэдкіх і каштоўных выданняў для кожнага карыстальніка бібліятэк Беларусі, даўшы яму магчымасць азнаёміцца з найлепшымі выданнямі як з бібліятэчнага фонду краіны, так і з калекцый замежных устаноў, якія супрацоўнічаюць з айчыннымі бібліятэкарамі і маюць адпаведныя пагадненні, а таксама — адкрыўшы магчымасць азнаёміцца са шматлікімі віртуальнымі выставамі ды іншымі рэсурсамі.

Вядома, стварэнне такой сістэмы — справа не аднаго дня, яна патрабуе прыкладання значных высілкаў, але першы крок у гэтым кірунку робіцца ўжо сёння.

**Антон РУДАК**